**ПАЛАЖЭННЕ**

аб правядзенні раённага творчага конкурсу на лепшы аўтарскі верш
“Паэтычны настрой”

## 1. Агульныя палажэнні

1.1. Раённы творчы конкурс на лепшы аўтарскі верш “Паэтычны настрой …” (далей – Конкурс) праводзіцца ў рамках паэтычнага праекта дзяржаўнай установы культуры “Мастоўская раённая бібліятэка” “Масты сугучнасці”.

1.2. Палажэнне вызначае агульны парадак правядзення раённага творчага конкурсу на лепшы аўтарскі верш “Паэтычны настрой”.

1.3. Арганізатарамі Конкурсу з’яўляюцца Мастоўскі раённы выканаўчы камітэт, сектар культуры Мастоўскага раённага выканаўчага камітэта дзяржаўная установа культуры “Мастоўская раённая бібліятэка”, Мастоўская раённая арганізацыя грамадскага аб’яднання “Белая Русь”, Гродзенскае абласное аддзяленне грамадскага аб’яднання “Саюз пісьменнікаў Беларусі”.

1.4. Прыняць удзел у конкурсе можа любы жыхар Мастоўскага раёна і горада Масты ва ўзросце ад 14 гадоў і больш.

## 2. Мэты і задачы Конкурсу

2.1. Конкурс праводзіцца з мэтай выяўлення, папулярызацыі здольнасцей таленавітых падлеткаў і дарослых – жыхароў Мастоўшчыны, якія пішуць вершы, і стварэнне ўмоў для іх актыўнай творчай дзейнасці.

2.2. Асноўнымі задачамі Конкурсу з’яўляюцца:

- стварэнне асяроддзя творчых зносін, сітуацыі поспеху;
- спрыянне развіццю творчага патэнцыялу і папулярызацыі паэтычных здольнасцяў аўтараў – жыхароў г.Масты і Мастоўскага раёна;
- фарміраванне пазітыўнага вобраза беларускай жанчыны, якая спалучае ў сабе мацярынства і прафесіяналізм, інтэлект і душэўную шчодрасць, гаспадарлівасць і актыўную грамадзянскую пазіцыю;
- выяўленне і далучэнне да дзейнасці ГА “Белая Русь” найбольш таленавітых і здольных прадстаўнікоў Мастоўшчыны;
- прадастаўленне магчымасці для пераможцаў прадэманстраваць свае паэтычныя здольнасці перад насельніцтвам раёна.

## 3. Умовы і тэрмін правядзення Конкурсу

3.1. Конкурс праводзіцца з 15 красавіка 2026 года па 22 мая 2026 года.

3.2. Прыём заявак ажыццяўляецца з 15 красавіка 2026 года па 10 мая 2026 года.

3.3. Вершы, высланыя пазней пазначанага тэрміну, разглядацца журы не будуць.

3.4. У Конкурсе могуць прыняць удзел усе жыхары горада Масты і Мастоўскага раёна, ва ўзросце ад 14 гадоў і больш, згодныя з умовамі Конкурсу і гэтым Палажэннем.

3.5. Конкурс праводзіцца па дзвюх намінацыях:

- "Жаночы сусвет" («Женская вселенная») – тэматыка прадстаўленых вершаў шырокая: мацярынства і любоў да дзяцей, сям'я і сямейныя традыцыі, жаночая прыгажосць і душэўная шчодрасць, гаспадарлівасць і актыўная грамадзянская пазіцыя; іншыя вершы, якія спрыяюць фарміраванню пазітыўнага вобраза беларускай жанчыны і сямейных каштоўнасцей;

- "Душы і сэрца натхненне" («Души и сердца вдохновенье») – вершы на вольную тэму, якія, на погляд аўтара, найлепш адлюстроўваюць яго сутнасць.

3.6. На Конкурс прымаюцца толькі вершы.

3.7. Удзельнік можа прадставіць на Конкурс не больш за тры вершы ў кожнай намінацыі.

3.8. Вершы прымаюцца ў суправаджэнні заяўкі згодна Дадатка 2.

3.9. Заяўкі і конкурсныя работы прымаюцца па адрасу: г.Масты, вул. Савецкая, 19Б, ДУК "Мастоўская раённая бібліятэка", аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы альбо па электроннай пошце - info@mostylib.by з паметкай – конкурс "Паэтычны настрой".

3.10. Па пытаннях арганізацыі і правядзення конкурсу звяртацца па тэлефону 8(015-15) 6-45-01 або на электронную пошту: info@mostylib.by

## 4. Патрабаванне да работ

4.1. На Конкурс прымаюцца:

- вершы любога аб'ёму;
- вершы, незалежна ад даты іх напісання;
- вершы павінны быць напісаны на беларускай ці на рускай мовах;
- вершы, якія змяшчаюць ненарматыўную лексіку, а таксама вершы, якія маюць у змесце прыкметы распальвання нацыянальнай, расавай альбо рэлігійнай варожасці да конкурсу не дапускаюцца;
- вершы павінны мець назву і могуць суправаджацца каментарыямі аўтара.

4.2. Накіроўваючы свае вершы на Конкурс, кожны ўдзельнік павінен запоўніць Заяўку (Дадатак 2) і прадаставіць поўную інфармацыю пра сябе:

- прозвішча, імя, імя па бацьку;
- дата нараджэння;
- месца работы, вучобы;

- хатні адрас, тэлефон.

4.3. Удзельнік конкурсу павінен даць пісьмовую згоду (Дадатак 3) на апрацоўку персанальных дадзеных і на размяшчэнне аўтарскіх вершаў у сацыяльных сетках, на сайце ўстановы, на выкарыстанне інфармацыі аб удзельніку конкурса і яго творчасці ў артыкулах і рэкламе і г.д. без выплаты аўтарскага ўзнагароджання.

**5. Падвядзенне вынікаў Конкурсу, узнагароджанне**

5.1. Для падвядзення вынікаў Конкурсу складаецца журы (Дадатак 1).

5.2. Конкурсны адбор работ удзельнікаў ажыццяўляецца на аснове экспертных адзнак, якія выстаўляюцца членамі журы.

5.3. Па выніках Конкурсу журы вызначае пераможцаў - I, II, III месца па кожнай намінацыі.

Журы застаўляе за сабой права не прысуджаць узнагароды ці прысудзіць два дыпломы за I, II, III месца па адной з намінацый (пры адсутнасці ўдзельнікаў у намінацыі).

5.4. Работы ўдзельнікаў Конкурсу ацэньваюцца журы па наступных крытэрыях:

- паэтычная пісьменнасць (памер, рытм, рыфма, мілагучнасць);
- адпаведнасць патрабаванням тэматыкі;
- мастацкая задума (арыгінальнасць і самабытнасць);
- мастацкая выразнасць (стылістычнае адзінства творчай працы і валоданне мастацкімі сродкамі мовы);
- іншыя асаблівасці.

5.5. Матэрыялы, якія не адпавядаюць патрабаванням да конкурсных работ, і якія паступілі пазней 10 мая 2026 года разглядацца не будуць.

5.6. Вынікі Конкурсу падводзяцца з 11 мая да 21 мая 2026 года і афармляюцца пратаколам.

5.7. Пераможцы ацэньваюцца па максімальнай колькасці балаў. Пры роўнай колькасці балаў пераможца вызначаецца членамі журы ў ходзе галасавання большасцю галасоў; пры роўнасці галасоў вырашальным з’яўляецца голас старшыні журы.

5.8. Вершы ўдзельнікаў і спіс пераможцаў Конкурсу будуць асвятляцца на сайце ДУК “Мастоўская раённая бібліятэка”, у сацыяльных сетках, тэлеграм-канале.

5.9. Узнагароджанне пераможцаў Конкурсу адбудзецца на другім фестывале паэзіі “Масты сугучнасці” 22 мая 2026 года. Пераможцам, якія атрымаюць Дыпломы I ступені, будзе дана магчымасць прачытаць свой верш са сцэны ў час фестывалю.

5.10. Удзельнікі, якія занялі прызавыя месцы атрымоўваюць дыплом у фотарамцы і падарункавы сертыфікат.

## 6. Фінансаванне Конкурсу

6.1. Фінансаванне расходаў на правядзенне Конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў раённага бюджэту, прадугледжаных на цэнтралізаваныя мерапрыемствы сектара культуры Мастоўскага раённага выканаўчага камітэту і Мастоўскай раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання "Белая Русь".

6.2. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуецца: выраб дыпломаў, набыццё фотарамак (для афармлення дыпломаў) і падарункавыя сертыфікаты пераможцам Конкурсу.

6.3. За кошт сродкаў Мастоўскай раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання "Белая Русь" фінансуецца: набыццё падарункавых салодкіх набораў для пераможцаў Конкурсу.

6.4. Фінансаванне Конкурсу можа ажыццяўляцца за кошт іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Дадатак 1

**СКЛАД ЖУРЫ**
раённага творчага конкурса на лепшы аўтарскі верш
“Паэтычны настрой”

1. Давыдзік Марына Осіпаўна, намеснік старшыні Мастоўскага райвыканкама, старшыня Мастоўскай раённай арганізацыі грамадскага аб’яднання “Белая Русь” – старшыня журы;
2. Палуйчык Анастасія Валер’еўна, загадчык сектарам культуры Мастоўскага райвыканкама;
3. Стэльмах Таццяна Іосіфаўна, дырэктар дзяржаўнай установы культуры “Мастоўская раённая бібліятэка”;
4. Кебіч Людміла Антонаўна, старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення грамадскага аб’яднання “Саюз пісьменнікаў Беларусі”;
5. Радзівончык Дзмітрый Мікалаевіч, намеснік старшыні Гродзенскага абласнога аддзялення грамадскага аб’яднання “Саюз пісьменнікаў Беларусі”;
6. Бачко Ірына Пятроўна, галоўны рэдактар ўстановы “Рэдакцыя газеты “Зара над Нёманам”, член праўлення Мастоўскай раённай арганізацыі грамадскага аб’яднання “Беларускі саюз жанчын”;
7. Бісерава Вольга Іванаўна, намеснік дырэктара дзяржаўнай установы культуры “Мастоўская раённая бібліятэка”.

Дадатак 2

ЗАЯЎКА
на ўдзел у раённым творчым конкурсе на лепшы аўтарскі верш
"Паэтычны настрой"

1. Прозвішча________________________________________________

2. Імя_____________________________________________________

3. Імя па бацьку_________________________________________

4. Узрост__________________________________________________

5. Месца вучобы альбо працы_______________________________
__________________________________________________________

6. Адрас і кантактны тэлефон,
e-mail ____________________________________________________
__________________________________________________________

7. Намінацыя "Жаночы сусвет" («Женская вселенная»)
Назва вершаў _______________________________________________
__________________________________________________________
__________________________________________________________

9. Намінацыя "Душы і сэрца натхненне" («Души и сердца вдохновенье»)
Назва вершаў _______________________________________________
__________________________________________________________
__________________________________________________________

«___» _____________20___г. ______________ ___________

дата подпіс ініцыялы, прозвішча

Дадатак 3

ЗГОДА НА АПРАЦОЎКУ ПЕРСАНАЛЬНЫХ ДАДЗЕНЫХ

Я ____________________________________________________________

даю згоду на апрацоўку персанальных дадзеных, якія змяшчаюцца ў заяўцы, для ўдзелу ў Конкурсе і размяшчэння інфармацыі аб Конкурсе, у тым ліку фатаграфій, зробленых у ходзе падвядзення вынікаў Конкурсу, на афіцыйных сайтах Мастоўскага раённага выканаўчага камітэту, установы “Рэдакцыя газеты “Зара над Нёманам”, дзяржаўнай установы культуры “Мастоўская раённая бібліятэка”, грамадскага аб’яднання “Саюз пісьменнікаў Беларусі”, іншых дзяржаўных устаноў; на размяшчэнне аўтарскіх вершаў у сацыяльных сетках, на сайтах установы “Рэдакцыя газеты “Зара над Нёманам”, дзяржаўнай установы культуры “Мастоўская раённая бібліятэка”, на выкарыстанне інфармацыі аб удзельніку конкурса і яго творчасці ў артыкулах і рэкламе і г.д. без выплаты аўтарскага ўзнагароджання.

| ____________________ | ____________________ | ____________________ |
|---|---|---|
| дата | подпіс | ініцыялы, прозвішча |